и небольших деревнях. Жители деревень оказывают большое влияние на развитие и благополучие нашей Родины.

Приложение

QR-код доступа к презентации и материалам

*Дата поступления в редакцию: 29.12.2023*

# ПЛАН-СЦЭНАРЫЙ УРОКА ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА” У XI КЛАСЕ ВЭБ-КВЭСТ «БЫЎ. ЁСЦЬ. БУДУ»: ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ У. КАРАТКЕВІЧА

*Маліноўская Валянціна Мікалаеўна*

**Мэта:** сістэматызаваць і пашырыць веды вучняў пра жыццё і творчасць У. Караткевіча; развіваць лагічнае мысленне, пазнавальную актыўнасць, навыкі работы ў камандзе; выхоўваць цікавасць да беларускай літаратуры, гонар за свой беларускі край і яго творчую спадчыну.

**Задачы:** стварыць умовы для фарміравання навыкаў групавой і індывідуальнай працы, развіцця самастойнасці, творчых здольнасцей і крытычнага мыслення вучняў.

**Тып урока:** урок паўтарэння і абагульнення матэрыялу.

**Форма работы:** урок-квэст.

**Умовы правядзення:** да пачатку ўрока вучні павінны размеркавацца па групах; уважліва пазнаёміцца з заданнямі і размеркаваць ролі ў групе (збіральнік інфармацыі, дакладчык, дызайнер, рэцэнзент); выканаць прапанаваныя заданні і падрыхтавацца да абароны сваіх работ.

**Абсталяванне:** партрэт У. Караткевіча, выстава кніг пісьменніка, відэа-, аўдыязапісы.

## Ход урока

(Чытанне верша “Бацькаўшчына”У. Караткевіча загадзя падрыхтаванай вучаніцай).

**І. Уступнае слова настаўніка.**

Вялікі сын вялікага народа. Першаадкрывальнік многіх тэматычных пластоў у нацыянальнай літаратуры. Выдатны мастак слова і не менш выдатны гісторык. Фатограф-прафесіянал. Непераўзыдзены жартаўнік, душа кампаніі. Эрудыт, якіх мала ведала і мала зведае зямля Беларусі. Сапраўдны таварыш, сябра. Усё гэта — пра хлопца з Оршы, з наддняпроўскай кручы… Ён валодаў светам (пра тое — яго імя), валодаў і валодае, ужо далёкі ад нас, людскімі душамі. Ён у памяці чалавечай — геній, прарок, гуманіст.

Я запрашаю вас прыняць удзел у літаратурным квэсце і чарговы раз далучыцца да цудоўнай спадчыны вялікага класіка. Жадаю ўсім поспехаў!

**ІІ. Выступленне каманд.**

**Сацыяёлагі.**

1. Правядзіце анкетаванне сярод сваіх знаёмых, бацькоў, суседзяў. Уключыце пытанні: хто такі Уладзімір Караткевіч, якія асацыяцыі ўзнікаюць у іх, калі яны чуюць гэтае імя, якія творы У. Караткевіча яны могуць назваць і інш.
2. Прааналізуйце выказванні вядомых людзей пра Уладзіміра Караткевіча і яго творчасць. Выберыце 2-3 з іх, якія вам падаліся больш цікавымі, якія вам хацелася б прачытаць у класе. Абгрунтуйце свой выбар.
3. Выкананыя заданні аформіце на слайдзе 2 сумеснай прэзентацыі.

**Біёграфы.**

1. Уважліва пазнаёмцеся з біяграфіяй Уладзіміра Караткевіча.
2. Складзіце храналагічную табліцу жыццёвага шляху пісьменніка. Размясціце яе на слайдзе 3 сумеснай прэзентацыі.
3. Выберыце тры факты біяграфіі, якія ўразілі вас, аб якіх вы раскажаце ў класе.

**Даследчыкі творчасці.**

1. Уважліва пазнаёмцеся з біяграфіяй Уладзіміра Караткевіча.
2. З чаго пачалася творчая дзейнасць пісьменніка. Які твор прынёс яму вядомасць? Якія творы і тэмы адметныя ў творчасці пісьменніка?
3. Прыдумайце і аформіце вокладку кнігі да вядомага вам твора Уладзіміра Караткевіча. Выканайце яе ў выглядзе плаката і размясціце на слайдзе 4 сумеснай прэзентацыі.

**Літаратуразнаўцы.**

1. Якімі адметнымі рысамі характару вызначаецца Караткевічаў герой часу? Вызначце адметныя рысы на прыкладзе вядомай вам аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха”.
2. Зрабіце яго характарыстыку: узрост, сацыяльнае

становішча, адносіны да жыцця, дзве-тры вызначальныя рысы характару і інш.

3. Інфармацыю размясціце на слайдзе 5 сумеснай прэзентацыі.

**Гісторыкі.**

1. Як ушаноўваецца памяць пра Уладзіміра Караткевіча ў нашай краіне?

2. Помнік якому вядомаму караткевічаўскаму герою вы прапанавалі б паставіць? Дзе ён мог бы знаходзіцца? Як бы, на ваш погляд, мог выглядаць?

3. Свае прапановы аформіце і размясціце на слайдзе 6 сумеснай прэзентацыі, каб паказаць у класе.

**Журналісты.**

1. Зрабіце газету, прысвечаную У.Каратквічу (да 25 лістапада 2020 г.).

2. Аформіце слайд 7 сумеснай прэзентацыі ў выглядзе насценгазеты, прысвечанай У. Каратквічу і растлумачце, чаму Вы змясцілі гэтыя аб'екты.

3. Падрыхтуйце артыкул пра сваю працу ў камандзе на сайт установы адукацыі.

**III. Праходжанне квэста.**

**Конкурс 1 "Жыццёвыя дарогі".** Устаўце ў прапушчаныя месцы словы з даведкі.

1. Нарадзіўся ______________ ў горадзе ________Віцебскай вобласці. Тады гэта быў маленькі гарадок. Зялёныя вуліцы, рэшткі валоў замчышча, гудкі далёкіх цягнікоў і блізкіх параходаў (чыгунка і аўтобусы яшчэ не забілі раку), дубовыя лясы на берагах і ліпы на вуліцах, недалёкія парогі.

2. Пісаць (а спачатку «бубніць») вершы пачаў год у _________, але, на шчасце, хутка кінуў гэты занятак. Трохі пазней спрабаваў пісаць апавяданні, прычым абавязкова іх_____________________.

3. Быў спачатку ў Маскве, потым на Разаншчыне. Пасля давялося ўцякаць і адтуль. На Урал, у наваколле Кунгура. Выпадкова даведаўся, што бацькі ў________________.

4. Восенню ______________ пераехалі ў Беларусь. І вось тут упершыню ўбачыў сапраўдны разор, «зону пустыні», некалькі ўскраінных завулкаў, як канцы галінак ля згаслага вогнішча. Гарады, дзе нават руінаў не было. (Немцы разабралі іх на цэглу для абаронных патрэб.) Да голаду і холаду было не звыкаць, але тут, на выпаленай зямлі, так намерзліся, што часам хацелася памерці, абы толькі цябе пахавалі ў печцы.

5. У ____________________я паступіў у Кіеўскі ўніверсітэт на філалагічны факультэт. Вучыўся, быў шчаслівы, меў шмат сяброў...

6. Пасля заканчэння ўніверсітэта я здаў кандыдацкі мінімум і пачаў быў пісаць дысертацыю пра паўстанне 1863 г. ва ўсходнеславянскіх і польскай літаратурах, але прыйшлі іншыя інтарэсы: з'явілася задумка аб рамане на тую самую тэму. Да рэалізацыі яе, праўда, я прыступіў толькі праз______________________. Над гэтым раманам — «Каласы пад сярпом тваім» — працую і зараз.

7. І раптам улетку ________________ атрымаў нумар часопіса са сваім вершам «Машэка». Гэта пераламіла мой лёс. Потым з'явіліся яшчэ вершы. За __________ гады, што (пасля вёскі) працаваў у Оршы, я падрыхтаваў першы зборнік «Матчына душа» і атрымаў прэмію за п'есу «Млын на Сініх Вірах» (паставіла яе беларускае тэлебачанне).

8. Літаратурныя курсы шмат далі мне самой сваёй атмасферай, глыбінёй спрэчак, сяброўствам, шырынёй далягляду. Там я напісаў сваю другую кнігу ______________(1960), некалькі апавяданняў і гістарычную аповесць ...

9. Пасля _____________ перапынку здаў у «Полымя» новы свой раман «Каласы пад сярпом тваім». Здаў першы том. Другі не выпускаю з рук, дапрацоўваю. Пастараўся заплаціць гэтай кнігай доўг Дняпру, людзям паўстання ____________.

Даведка: Орша, шэсць, ілюстраваў, «Сівая легенда», двух год, 1863 г., Беларусі, Арэнбургу, сорак чацвёртага, сорак дзявятым годзе, дванаццаць год, 1955 года, два, «Вячэрнія ветразі».

**Конкурс 2 "Яны глядзяць на нас з партрэтаў".** Пазнайце па фотаздымках беларускіх творцаў, запішыце і перадайце журы.



**Конкурс 3 "Паэтычная і празаічная спадчына У. Караткевіча"**. Запішыце адказ на картцы. Выберыце, якія зборнікі належаць пісьменніку.

| Зборнікі | Творы У. Караткевіча | Зборнікі іншых аўтараў |
|---|---|---|
| "Матчына душа", "Мая Іліяда", "Быў. Ёсць. Буду", "Вячэрнія ветразі" | "Зямля пад белымі крыламі", "Блакіт і золата дня", "Чазенія", "Вока тайфуна", "Каласы пад сярпом тваім" | "Журавінавы цвет", "Жалейка", "Вянок", "Раскіданае гняздо", "Мая Бесядзь", "Нарач", "Людзі на балоце" |

**Конкурс 4 "Пазнайце літаратурны твор".** Прывядзіце аргументаваныя доказы. (Малюнак).

**Конкурс 5 "Напісанае застаецца".** Запішыце правільны адказ.

1. Напішыце гарады, якія звязаны з жыццём і творчасцю Караткевіча. *(Орша, Масква, Кіеў, Мінск, Рагачоў).*

2. Казкамі якога пісьменніка быў настолькі ўражаны маленькі Валодзя, што нават напісаў да яго ліст і, дарэчы, атрымаў адказ? *(Карней Чукоўскі).*

3. З якімі пісьменнікамі параўноўваюць У. Караткевіча? *(Аляксандр Дзюма, Генрык Сянкевіч, Вальтр*




Малюнак

*Скот).*

4. Якая кніга была любімай у Валодзі Караткевіча? *(“Тры мушкецёры”).*

5. Які з празаічных твораў У. Караткевіча можна назваць самым аўтабіяграфічным? *(“Лісце каштанаў”).*

6. Каму са сваякоў У. Караткевіч прысвяціў адзін з першых яго твораў, апавяданне “Багун-трава”, а таксама раман “Каласы пад сярпом тваім”? *(Маці).*

7. Якія вобразы-сімвалы Беларусі характэрныя для творчасці У. Караткевіча? *(Бусел, шыпшына).*

**IV. Падвядзенне вынікаў квэста.**

Быў. Ёсць. Буду.

Таму, што заўжды, як пракляты,
Жыву бяздоннай трывогай,
Таму, што сэрца маё распята
За ўсе мільярды двухногіх.

**Слова настаўніка.** Такія радкі ў пасмяротнай кнізе «Быў. Ёсць. Буду». Так і здарылася. Спадзяюся, што знаёмства з творчай спадчынай працягнецца, кожны з вас адкрые для сябе свайго Караткевіча.

**V. Прагляд відэаролiка на верш У.Караткевіча “Беларуская песня”.**

*Дата поступления в редакцию: 29.12.2023*

# ПЛАН-КОНСПЕКТ УРОКА ПО УЧЕБНОМУ ПРЕДМЕТУ «МАТЕМАТИКА» В VI КЛАССЕ НА ТЕМУ «СРАВНЕНИЕ РАЦИОНАЛЬНЫХ ЧИСЕЛ»

*Снарская Инна Павловна*

**Цель:** научиться сравнивать рациональные числа, используя правило сравнения.

**Задачи урока:**

создать условия для

формирования умений понимать сущность алгоритмических предписаний и умения действовать в соответствии с предложенным алгоритмом;

обучения учащихся применять теоретические знания в незнакомой ситуации;

развития коммуникативных способностей и мышления учащихся;

воспитания потребности в самообразовании.

**Тип урока:** изучение нового материала.

**Оборудование:** классная доска, мультиборд, раздаточный материал, мобильные телефоны с выходом в интернет, интерактивный плакат.

**Место урока в развороте учебной программы:** первый урок по теме «Сравнение рациональных чисел» изучения раздела «Рациональные числа».

**Ход урока**

**I. Организационный этап.**

*Деятельность учителя.* Педагог приветствует учащихся, проверяет готовность их к уроку, ориентирует на продуктивную работу.

*Деятельность учащихся.* Приветствуют учителя, настраиваются на результативную познавательную деятельность на уроке.

**II. Этап проверки домашнего задания.**

*Деятельность учителя.* Педагог организует проверку домашнего задания по интерактивному плакату (раздел «Проверь себя»), комментируя используемые правила (рисунок 1). За верно выполненные задания учащимся предлагается воспользоваться дополнительным баллом на любом уроке по данной теме.




Рисунок 1